# На выстаўках

У двух мінскіх бібліятэках — імя Леніна і імя Горкага—адкрыліся выстаўкі, прысвечаныя 150-годдзю з дня нараджэння А. С. Пушкіна.

Выстаўка ў бібліятэцы імя Горкага адкрываецца выказваннямі В. І. Леніна, І. В. Сталіна і М. І. Калініна аб Пушкіне. На вітрынах выстаўлены тамы твораў Бялінскага, Дабралюбава і Чэрнышэўскага, у якіх змешчаны крытычныя артыкулы аб творчасці паэта.

Цікавыя вітрыны, дзе адлюстравана гісторыя стварэння такіх твораў, як «Яўгені Анегін», «Дуброўскі», «Капітанская дачка».

Вялікую выстаўку арганізавала бібліятэка імя Леніна. Яна шырока паказвае дзіцячыя і юнацкія гады паэта, асноўныя даты яго жыцця і творчасці. Бібліятэка выставіла рэдкія выданні пушкінскіх твораў, якія друкаваліся яшчэ пры яго жыцці. Паказаны часопісы «Вестник Европы» за 1814 год, «Сын отечества» за 1815 і 1821 гады, «Северные цветы», «Полярная звезда», «Северная пчела», «Московский альманах» і многія іншыя. У кожным з іх змешчаны асобныя вершы вялікага паэта або ўрыўкі з яго паэм.

Абедзве выстаўкі карыстаюцца вялікім поспехам у мінчан. Іх наведалі ўжо тысячы жыхароў горада.